# МУЗЕЯЗНАЎСТВА

УДК 069:94(1-21)]:930(476)(470+571)(4-15)"18/20"

*Ю. В. Кавалёва*

## Гістарыяграфія музеяў гісторыі гарадоў

*У аснове даследавання – пытанні гістарыяграфіі музеяў гісторыі гарадоў у айчынным, расійскім і заходнееўрапейскім музеязнаўстве канца XIX – пачатку XXI ст. Вылучаюцца храналагічныя этапы ў развіцці дадзенай тэмы. Разглядаюцца матэрыялы міжнародных навуковых канферэнцый з 2005 па 2019 гг., публікацыі часопіса Камітэта па калекцыях і дзейнасці музеяў гарадоў (САМОС), якія тычацца вызначэння сутнасці музея горада і яго ўплыву на культурнае жыццё насельніцтва. Гістарыяграфія музеяў Беларусі асвятляецца ў аспекце музеефікацыі ўрбаністычнай прасторы. Паказана станаўленне музея як сацыякультурнага інстытута і яго роля ў пэўны гістарычны перыяд.*

Музеі гісторыі гарадоў – гэта асобная група музеяў, што вывучаюць гісторыю горада, у якім яны знаходзяцца і, як правіла, носяць яго імя. Такія музеі пачалі з'яўляцца ў Еўропе ў сярэдзіне XIX ст. Іх асэнсаванне як асобнай групы і першыя тэарэтычныя даследаванні на дадзеную тэму адносяцца да другой паловы XIX ст.

*Мэты артыкула* – зрабіць аналіз гісторыі вывучэння музеяў гарадоў у айчынным, расійскім і заходнееўрапейскім музеязнаўстве; вылучыць галоўныя напрамкі даследаванняў на сучасным этапе.

Адной з першых спроб тэарэтычнага абгрунтавання сутнасці музея горада з'яўляецца праца супрацоўніка музея горада Нью-Ёрка Джона Ван Пелта (John Van Pelt). Так, у кнізе «Our Greatest Artefact: the City» [45] змешчаны артыкул пра гісторыю станаўлення музеяў гарадоў, дзе прыводзяцца ўрыўкі з прац Дж. Ван Пелта, якія былі апублікаваны ў 1931 г. у часопісе «The Museum News» Амерыканскай асацыяцыі музеяў. Аўтар прааналізаваў пытанні прызначэння музея горада, яго арыентацыі на гараджан або турыстаў, праблемы пабудовы гарадской экспазіцыі, падкрэсліў адрозненне музеяў дадзенага тыпу ад гістарычных і краязнаўчых. Па сутнасці, зроблена спроба надаць такому музею функцыю саўдзельніка горадабудаўнічых працэсаў. Дж. Ван Пелт акцэнтаваў увагу на ролі музея гісторыі горада ва ўрбаністычнай прасторы [Там жа].

У Расійскай імперыі музеі гісторыі гарадоў узніклі, як і еўрапейскія, у другой палове XIX ст. Гэта было звязана з гарадской рэформай 1870 г.



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Заснаваныя ў гэты перыяд музеі Масквы, Санкт-Пецярбурга, Мінска напачатку былі музеямі камунальнай гаспадаркі. Пазней у сувязі з Кастрычніцкай рэвалюцыяй, Грамадзянскай вайной 1917–1922 гг. і іншымі гістарычнымі і палітычнымі падзеямі яны трансфармаваліся і да сярэдзіны XX ст. ператварыліся ў музеі гісторыі гарадоў. У пачатку дзейнасці музейныя ўстановы вывучалі гісторыю горада. Так, са Статута Мінскага гарадскога музея вядома, што дадзеная функцыя прапісана ў першым параграфе [36, с. 1]. Статут 1911 г. з'яўляецца важнай крыніцай для вывучэння музейнай справы ў Беларусі, гістарыяграфіі гістарычных музеяў і музеяў гісторыі гарадоў.

Тэарэтычнае асэнсаванне музеяў такога тыпу на тагачасным этапе ўяўлялася малаверагодным, бо яны знаходзіліся на стадыі фарміравання. Увагі заслугоўвае праца М. І. Раманава [30], у якой аўтар разважаў пра музеі гісторыі асобных рэгіёнаў. Ён падкрэсліваў розніцу паміж нацыянальнымі і мясцовымі музеямі. Нацыянальныя буйныя музеі – галоўныя захавальнікі артэфактаў і культурных каштоўнасцей дзяржавы. Задача мясцовых музеяў – усебакова раскрыць гісторыю канкрэтнага рэгіёна (сяла, горада, вобласці). На думку М. І. Раманава, мясцовы музей можа адлюстроўваць як гісторыю рэгіёна цалкам, так і асобнае рамяство або іншы занятак, характэрны для пэўнай вобласці. Ён звярнуў увагу на важнасць удзелу мясцовага насельніцтва ў жыцці музея праз стварэнне Савета музея, Гаспадарчага камітэта [Там жа, с. 9–18]. Гэтая прагрэсіўная на той час думка і сёння разглядаецца як важны аспект жыццяздольнасці музея і яго паспяховай камунікацыі з мясцовымі гарадскімі супольнасцямі.

Упершыню групу гарадскіх музеяў як асобную катэгорыю вылучыў В. Я. Рудакоў [32]. Л. А. Ільін сфармуляваў паняцце «гарадскі музей», вызначыў яго адметныя рысы. Пад музеем горада на той час разумеліся мастацкія галерэі з твораў сусветнага мастацтва або зборы твораў мясцовага мастацтва, археалогіі, гісторыі і іншых прадметаў, якія звязаны з культурай рэгіёна з цэнтрам у горадзе. Такім чынам, у 1920-я гг. тэрмін «гарадскі» ўказваў або на ведамасную прыналежнасць музея, або на яго змест. Да музеяў такога тыпу адносіліся і зборы музейных прадметаў, якія захоўваліся ў пэўным горадзе [13, с. 5–7].

У 1920-я гг. Музеем горада (г. Петраград) пад кіраўніцтвам вучонага сакратара І. Ф. Кларка былі апублікаваны выданні аб аддзелах музея з падрабязным апісаннем фондавых калекцый, таксама вызначаны прынцыпы пабудовы экспазіцыі і напрамкі працы па камплектаванні фондаў па секцыях: унутранага аздаблення жылля, плаціроўкі і забудовы, садова-паркавай справы, тэхнічны аддзел, музей старога Санкт-Пецярбурга [22].

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

У 1930-я гг. польскі вайсковы юрыст Т. М. Жук-Рыбіцкі спрабаваў стварыць музей гісторыі Брэста. Ён пакінуў нататкі пра гісторыю станаўлення і калекцыі музея, якія пазней увайшлі ў калекцыю Археалагічнага музея «Бярэсце». Але музеі гісторыі Брэста і Мінскі гарадскі на той час не атрымалі далейшага развіцця ў сувязі з гістарычнымі падзеямі – Першай і Другой сусветнымі войнамі.

У СССР музеі гісторыі гарадоў не разглядаліся адасоблена ад гістарычных музеяў. Адзіная крыніца, якая сведчыць пра цікавасць да дадзенай групы музеяў, – артыкул У. П. Нікаленкі «Музей гісторыі сталіцы» [25, с. 121–131]. Але ён не ахоплівае ўвесь комплекс такіх устаноў, разглядае толькі сталічныя і ігнаруе ўсе астатнія.

У 1950–1960-я гг. музеі Масквы і Санкт-Пецярбурга публікавалі справаздачы з апісаннем структуры музея і яго экспазіцыі, у якіх былі змешчаны і статыстычныя даныя, і аналітычная інфармацыя. Рабілася спроба выявіць характэрныя асаблівасці музея, яго функцыі і задачы. Цікавыя звесткі музеяграфічнага характару ўтрымлівае праца І. С. Раманоўскага [31].

Даследаванні музеяў гісторыі гарадоў актывізаваліся ў 1990-я гг. з узнікненнем прафесійных асацыяцый, такіх як Міжнародная асацыяцыя музеяў гарадоў (1995, г. Барселона). Новы этап у вывучэнні музеяў гарадоў пачаўся з выхадам у свет часопіса «Музеум» (1996), у якім друкаваліся артыкулы гістарыяграфічнага характару, гісторыі стварэння і дзейнасці музеяў гарадоў розных краін свету, прычыны іх з'яўлення, функцыянальныя асаблівасці і інш. Сярод аўтараў часопіса – музейныя практыкі з усяго свету, супрацоўнікі музеяў М. Хебдзіч, Н. Джонсан і Н. Мерыман (Музей Лондана), К. Хейдэкен (Гарадскі музей Стакгольма), Б. Мелер (Музей гісторыі Польшчы; Варшава), Э. М. Колінз (Цэнтр гісторыі Манрэаля), Г. Бузінкай (Музей гісторыі Будапешта), Г. Амарэсвар (Міжкультурны цэнтр Універсітэта Канберы) і інш. [23].

Асацыяцыя музеяў гарадоў у канцы 1990-х – 2000-я гг. праводзіла канферэнцыі на тэмы, якія хвалявалі даследчыкаў. У зборніку артыкулаў «Гарадскія музеі як цэнтры грамадскага дыялогу» (2005, г. Амстэрдам) В. Лэйн, П. Вайлда, К. Рос, Х. Дэнійс, Р. Баўзідзі, Р. Клэйгс, М. Эрнст, Д. Флемінг, В. Коса, Ю. Дземідзенка і іншыя практыкі музейнай справы абгрунтавалі тэмы ўзаемадзеяння музея і горада, музея і яго жыхароў [43].

У 2005 г. у структуры ICOM (Міжнародны савет музеяў) створаны CAMOC (Камітэт па калекцыях і дзейнасці музеяў гарадоў). CAMOC штогод праводзіць канферэнцыі, дзе закранаюцца пытанні гісторыі ўзнікнення музеяў гарадоў і іх праблемы на сучасным этапе. Аналіз матэрыялаў канферэнцый выявіў шэраг праблем музеяў гісторыі гарадоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

САМОС таксама публікуе праграмы і тэзісы канферэнцый, выдае часопіс, які знаёміць з анонсам падзей (канферэнцыямі, семінарамі, выстаўкамі і інш.). Артыкулы ўдзельнікаў канферэнцый САМОС прысвечаны гісторыі асобных музеяў гарадоў, інфармацыйным тэхналогіям, экспазіцыям, выстаўкам, наладжванню адносін з гарадскімі супольнасцямі, у прыватнасці з мігрантамі. У 2015 г. былі апублікаваны матэрыялы семінара ў Берліне, дзе ўпершыню на міжнародным узроўні спрабавалі замацаваць дэфініцыю «музей горада» і распрацаваць яго класіфікацыю. Сярод артыкулаў у дадзеным кантэксце вылучаюцца даследаванні Рэйні Тысдэйл з Універсітэта Тафтса, аднаго з аўтараў блога «City Stories» [44].

У выніку аналізу артыкулаў часопісаў САМОС за перыяд 2011–2019 гг. [42], умоўна падзеленых па тэмах, можна вылучыць чатыры групы артыкулаў. Першая прысвечана інфармацыйным тэхналогіям, іх выкарыстанню ў музейнай справе, у прыватнасці ў экспазіцыйнай і культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў гісторыі гарадоў. Разглядаюцца разнастайныя мабільныя прылажэнні, якія дазваляюць музею выходзіць за межы сваіх сцен.

Другая група публікацый адрозніваецца канцэптуальным падыходам да пабудовы пастаяннай экспазіцыі або доўгатэрміновай выстаўкі гарадскога музея. Аналіз зместу дазваляе зрабіць выснову аб тым, што музеі гісторыі гарадоў імкнуцца да адлюстравання гарадской гісторыі не з пазіцыі дзяржавы, а менавіта з пазіцыі горада і яго жыхароў.

Трэцяя група артыкулаў прысвечана пытанням міграцыі і яе ўплыву на музеі гарадоў. Дадзеная праблема асабліва востра стаіць перад заходнееўрапейскімі краінамі, што абумоўлена палітычнымі прычынамі. Транснацыянальны склад гарадскога насельніцтва ўплывае на палітыку музея ў дачыненні да адлюстравання гісторыі сучаснасці, пабудовы дыялогу з першым пакаленнем гараджан і прыцягнення іх да спрадвечнай культуры горада.

Чацвёртая група артыкулаў асвятляе пытанні ўзаемадзеяння музеяў з наведвальнікамі, якія становяцца ўдзельнікамі гістарычнага працэсу трансфармацыі музея. Гэтая форма дзейнасці адкрывае ім доступ да музейных фондаў, садзейнічае стварэнню спецыяльных адукацыйных цэнтраў пры музеі, дзе наведвальнікі, як і ў архіве, змогуць адшукаць асабістыя гісторыі сваіх продкаў.

У канцы XX – пачатку XXI ст. на постсавецкай прасторы назіраецца рост увагі да музеяў гарадоў. У Беларусі былі створаны музеі гарадоў Брэста, Гомеля, Магілёва, Мінска. Першыя публікацыі аб іх з'явіліся ў часопісе «Белая Русь», дзе аўтарамі выступілі дырэктары музеяў Брэста [34] і Мінска [18]. Агульныя звесткі пра музеі гарадоў прадстаўлены ў працы А. А. Гужалоўскага [8]. Аб музеях Лондана, Парыжа, Прагі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Браціславы, Вроцлава, Лейдэна, Мюнхена, Хельсінкі і іншых гарадоў свету можна даведацца з вучэбнага дапаможніка Л. У. Бярэйшык і А. А. Гужалоўскага [4].

У 1994 г. Л. Д. Фёдарава апісала развіццё музеяў гісторыі гарадоў Украіны ў XIX–XX стст. [37]. Гэта першая спроба асэнсаваць ролю такіх музеяў на постсавецкай прасторы.

Прызнанне гарадскога музея важным інструментам захавання гістарычнай спадчыны гарадоў робіць тэму ўзнікнення, станаўлення і развіцця такіх устаноў актуальнай. Аднак да гісторыі гарадскога музея ў цэлым, як профільнай групы, так і асобных музеяў, даследчыкі звяртаюцца нячаста. Сярод даследаванняў, прысвечаных гісторыі гарадскіх музеяў, вылучаюцца працы Г. Р. Назіпавай «Казанский городской музей : Очерки истории 1895–1917 гг.» [24], Л. І. Пятровай «Городской музей и власть, 1880–1930-е годы» [28] (прысвечаны музею гісторыі Санкт-Пецярбурга), польскай даследчыцы М. Папёлэк «Ад камяніцы да музея: гісторыя будынка Музея Варшавы на рынку Старога горада» (пер. наш. – *Ю. К.*) [46].

У манаграфіі Л. Пятровай прадстаўлена гісторыя стварэння і трансфармацыі аднаго музея на фоне гістарычных падзей і ўзаемаадносін з уладай. У гэтым аспекце ўпершыню разглядаецца праца музея горада. Гэта падаецца вельмі важным з прычыны адміністрацыйнага статуса гарадскіх музеяў, іх муніцыпальнага падпарадкавання [28, с. 5–8].

У сучасных агульнамузеязнаўчых даследаваннях, дзе закранаецца тэма музеяў горада, часта прыводзіцца іх класіфікацыя і ў якасці спецыфічнай групы вылучаюцца музеі гісторыі гарадоў. Т. Груліх разглядае пытанні фарміравання рэгіянальных музеяў у Цэнтральнай Еўропе на прыкладзе Чэхіі і Славакіі [7]. Калектыўная праца «Музееведение. Музеи исторического профиля» – класіка музеязнаўчай літаратуры, у якой асвятляюцца сацыяльныя функцыі музеяў, іх навукова-даследчая дзейнасць, пытанні фондавай, экспазіцыйнай і масавай ідэйна-выхаваўчай работы [21].

Сярод замежных аўтараў варта адзначыць К. Хадсана, які ў даследаванні вылучыў асаблівыя на яго думку музеі, што пайшлі сваім шляхам развіцця, сталі першапраходцамі ў той ці іншай сферы музеязнаўства. Да ўплывовых музеяў ён адносіць Музей гісторыі Амстэрдама, Музей Варшавы, Музей Уільямсбурга і інш. [38].

У выніку аналізу літаратуры выявілася тэндэнцыя да разгляду пытанняў музеяў гісторыі гарадоў у рамках праблемы музеефікацыі. Сярод беларускіх навукоўцаў вылучаюцца даследаванні па музеефікацыі гістарычнага цэнтра Полацка Т. Джумантаевай [9], інтэрпрэтацыі і музеефікацыі Мазырскага замка М. Заяц [11], ратуш гарадоў Беларусі А. Трусава [35], музеефікацыі культурна-ландшафтных комплексаў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Д. Герасімёнка [6], архітэктурных помнікаў г. Заслаўя Г. Чухманавай [40] і інш. Асаблівую цікавасць прадстаўляе вывучэнне такіх гарадоў, як Полацк і Заслаўе. Там знаходзяцца музеі-запаведнікі, вельмі блізкія па сутнасці да музея горада паводле класіфікацыі М. Е. Каўлен [16].

Сярод расійскіх тэарэтыкаў музеефікацыі гарадскога асяроддзя, даследчыкаў гісторыі музеяў гарадоў найбольш вядомыя М. Е. Каўлен і А. М. Масцяніца. У манаграфіі М. Е. Каўлен музеефікацыя гісторыка-культурнай спадчыны прадстаўлена ў дынаміцы і шматграннасці праяўленняў і форм як адзін з асноўных напрамкаў музейнай дзейнасці. У гэтым кантэксце аналізуюцца пытанні паходжання музеяў, іх тыпалогіі, тэндэнцыі развіцця [15]. М. Е. Каўлен як аўтар шэрага работ па дадзенай тэме ў артыкуле «Средовой музей в пространстве города» прыводзіць уласную класіфікацыю музеяў гісторыі гарадоў, у аснове якой узаемадзеянне музея з акаляючым асяроддзем. Яна вылучае тры асноўныя мадэлі развіцця музеяў гісторыі гарадоў: калекцыйная, сацыяльная і асяроддзевая [16].

Значны ўклад у тэарэтычнае абгрунтаванне музеефікацыі гарадскога асяроддзя зрабіла А. М. Масцяніца. На прыкладзе еўрапейскіх музеяў яна разглядае падыходы да рэалізацыі асяроддзевай музеефікацыі ў дачыненні да цэнтра і кварталаў гарадоў XVII–XX стст. А. Масцяніца ў артыкуле «Музеефикация городской среды: подходы и методы» ўпершыню адлюстроўвае тэрміналагічныя, тэарэтычныя і метадалагічныя аспекты спосабаў музеефікацыі гарадскога асяроддзя, аналізуе вопыт прымянення метадаў «ex situ» і «in situ» ў практыцы стварэння музеяў пад адкрытым небам [20].

Сярод сучасных даследаванняў вылучаюцца вузкапрафіляваныя, якія тычацца асобных аспектаў функцыянавання музея гісторыі горада. Аналіз артыкулаў, прысвечаных дзейнасці музеяў гісторыі гарадоў, дазваляе вылучыць наступныя тэмы.

Адным з найбольш праблемных напрамкаў з'яўляецца вывучэнне тэорыі экспазіцыі музеяў гісторыі гарадоў. Так, расійскі музеязнаўца, сцэнарыст музейных экспазіцый Т. П. Палякоў [29] звяртае ўвагу на той факт, што тэма музея ў гарадскім асяроддзі закранаецца дастаткова часта, а адваротная з'ява – інтэрпрэтацыя горада ў музейнай экспазіцыі вывучана недастаткова. Абапіраючыся на лакальна-гістарычны метад М. П. Анцыферава, ён разглядае праблему фарміравання вобраза горада ў культуры, месца і ролю музейнага праектавання ў вытворчасці культурных сімвалаў. Т. П. Палякоў прыводзіць шырокі гістарычны зрэз экспазіцыйнай канцэпцыі музеяў гісторыі гарадоў, вылучае этапы і падыходы да адлюстравання горада ў музеях на працягу XX ст. Як аўтар эксперыментальнага вобразна-сюжэтнага (мастацка-міфалагічнага) метаду праектавання музейных экспазіцый ён на прыкладзе музеяў гарадоў Разані і Екацярынбурга аналізуе канцэпцыі аўтарскіх экспа-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зіцыйных праектаў, якія трактуюцца як музейна-міфалагічныя гіпотэзы [Там жа, с. 6].

Пытанні ўзаемадзеяння горада і музея разглядаюцца ў работах А. А. Змеўла [12], І. Г. Малковай [19], В. В. Таўстагузавай, А. І. Маразан, Л. А. Катловай [33], Н. С. Каралёвай [17]. Яны аналізуюць месца і ролю музея ў гарадской культурнай прасторы на прыкладзе Ніжняга Ноўгарада, Іркуцка, Яраслаўля і гарадоў Уральскага рэгіёна. Асаблівая ўвага надаецца пытанню вызначэння паняцця «гарадская культурная прастора». Значэнне музея ў прасторы горада падаецца ў гістарычнай перспектыве, што дазваляе сфарміраваць цэласную карціну змянення ролі музеяў у горадзе на працягу XX ст.

Асаблівасці сацыякультурнай камунікацыі ў гарадской прасторы праз дзейнасць музея раскрываюцца ў артыкулах Д. А. Бутаковай і Н. І. Гаўрылавай [3], Я. А. Багатырова [2]. Я. А. Багатыроў вывучае праблемы фарміравання сацыякультурнай прасторы сучаснага горада. У якасці прыкладу аднаго з элементаў культурнай прасторы горада прыводзіцца Дзяржаўны музей імя А. С. Пушкіна. Д. А. Бутакова і Н. І. Гаўрылава разглядаюць музей як складаючую сацыякультурнай прасторы горада, аналізуюць асаблівасці культурнай камунікацыі сучасных музеяў на прыкладзе Музея гісторыі горада Іркуцка.

Іміджавая функцыя гарадскога музея актуалізуецца ў артыкулах М. Атрашкевіч [1], Н. В. Карэлінай [14], К. В. Шчарбаковай [41], В. М. Асташкіна [27]. М. Атрашкевіч вывучае тэрытарыяльны брэндынг на прыкладзе г. Віцебска. Яна робіць акцэнт на ролі музея ў фарміраванні іміджу рэгіёна, закранаючы яго маркетынгавы патэнцыял з мэтай прыцягнення турыстычных патокаў. Аналізуючы дзейнасць музеяў Масквы, В. М. Асташкін разглядае пытанні маркетынгу тэрыторый і ўплыву музея на іх развіццё.

Наступная група артыкулаў прысвечана спецыфічнаму функцыянальнаму прызначэнню музея гісторыі горада. Сярод навукоўцаў, якія вывучаюць дадзенае пытанне, В. В. Адзінцова [26], І. І. Ветраў [5], В. А. Чумічава [39]. Даследчыкі прыходзяць да высновы, што адным з асаблівых функцый музея горада з'яўляюцца фарміраванне гарадской самасвядомасці грамадзян і развіццё пачуцця патрыятызму ў дачыненні да роднага горада. В. В. Адзінцова і І. І. Ветраў на прыкладзе рэгіёна Сібіры падкрэсліваюць ролю гарадскіх музеяў у фарміраванні самасвядомасці мясцовага насельніцтва, атаясамленні сябе з прасторай малой радзімы, разуменні сваёй ролі ў жыцці роднага горада. Значэнне музея для сацыякультурнай самаідэнтыфікацыі асобы падкрэслівае ў артыкуле В. А. Чумічава. Яна прыходзіць да высновы, што музей выступае не толькі прасторай для далучэння да культур мінулых эпох, але і да культуры сучаснага горада.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асаблівасці работы па камплектаванні фондаў музеяў гісторыі гарадоў амаль не закранаюцца ў сучасных даследаваннях. Пры гэтым існуюць значныя адрозненні дадзенага напрамку дзейнасці нават у параўнанні з музеямі гістарычнага профілю. Гэтыя аспекты ў асноўным становяцца відавочнымі ў працэсе практычнай работы. Адзін з іх прааналізаваны ў артыкуле супрацоўнікаў Музея горада Новасібірска В. А. Дабарскай, А. Г. Кузняцовай [10]. Аўтары разглядаюць працу з гараджанамі ў працэсе камплектавання фондаў музея сямейнымі калекцыямі жыхароў горада.

Такім чынам, гістарыяграфія музеяў гісторыі гарадоў на сённяшні дзень ахоплівае дастаткова шырокае кола навуковай літаратуры. Храналагічна вылучаюцца тры перыяды: другая палова XIX ст. – 1920-я гг., сярэдзіна XX ст. – 1990-я гг., канец XX – пачатак XXI ст. Крыніцамі могуць служыць як даследаванні ў галіне музеефікацыі, дзейнасці асобных музеяў гісторыі гарадоў, так і працы краязнаўчага характару. Актуальнасць вывучэння дадзенай тэмы падмацавана ростам цікавасці з боку міжнароднай супольнасці праз стварэнне спецыялізаванага камітэта пры Міжнародным савеце музеяў, ростам колькасці публікацый па асобных напрамках работы музеяў гісторыі гарадоў.

Падсумоўваючы вынікі аналізу літаратуры па тэме, можна вылучыць наступныя напрамкі даследаванняў: гісторыя асобных музеяў гарадоў, узаемадзеянне горада і акаляючага асяроддзя, музеефікацыя гарадскіх тэрыторый. Дадзеныя тэмы фрагментарна асвятляюцца ў артыкулах айчынных і еўрапейскіх аўтараў. Асобныя манаграфічныя выданні прысвечаны пэўным музеям гісторыі гарадоў або тэрыторыям. Неабходна адзначыць адсутнасць цэласнага навуковага даследавання па гісторыі гарадскіх музеяў, іх спецыфіцы, сацыякультурнай ролі ў сучаснай урбаністычнай прасторы.

1. *Атрашкевич, М.* Город как бренд: Витебск в контексте территориального брендинга / М. Атрашкевич // Малевич. Классический авангард. Витебск – 15 : альманах / ред., авт. проекта Т. Котович. – Минск, 2016. – С. 200–207.

2. *Богатырев, Е. А.* Когнитивное и культурно-образовательное пространство города и его роль в развитии музея [Электронный ресурс] / Е. А. Богатырев // Вестн. Моск. гос. ун-та культуры и искусств. – 2011. – № 1 (39). – С. 143–149. – Режим доступа: https://elibrary.ru/download/elibrary_16380772_98804910.pdf. – Дата доступа: 29.10.2020.

3. *Бутакова, Д. А.* Музей в социокультурном пространстве города: особенности культурной коммуникации [Электронный ресурс] / Д. А. Бутакова, Н. И. Гаврилова // Теория и практика общественного развития. – 2011. – № 8. – С. 79–81. – Режим доступа: https://elibrary.ru/download/elibrary_17749229_84833047.pdf. – Дата доступа: 04.11.2020.

4. *Бярэйшык, Л. У.* Музеі замежных краін. Музеі Еўропы : вучэб. дапам. / Л. У. Бярэйшык, А. А. Гужалоўскі. – Мінск : БДУ, 2004. – 187 с.

5. *Ветров, И. И.* Музеи в массы: опыт выездных лекций по истории города Новосибирска и Октябрьского района (2010 г.) [Электронный ресурс] / И. И. Ветров //

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Баландинские чтения. – 2011. – Т. 6, № 1. – С. 21–22. – Режим доступа: http://elibrary.ru/download/elibrary_21341764_56147744.pdf. – Дата доступа: 29.10.2020.

*6. Герасімёнак, Д. В.* Музеефікацыя архітэктурна-ландшафтных комплексаў: праблемы вызначэння класіфікацыі / Д. В. Герасімёнак // Навуковы пошук у сферы культуры і мастацтва: традыцыі і сучаснасць : матэрыялы навук. канф., Мінск, 28 лістап. 2014 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: Ю. П. Бондар (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2016. – С. 73–77.

*7. Грулих, Т.* Региональные музеи и их роль в современном обществе / Т. Грулих // Музееведение. Музеи мира : сб. науч. тр. НИИ культуры. – М., 1991. – С. 287–292.

*8. Гужалоўскі, А. А.* Музеі Беларусі (1918–1941 гг.) / А. А. Гужалоўскі ; навук. рэд. У. М. Міхнюк. – Мінск : НАРБ, 2002. – 169 с.

*9. Джумантаева, Т. А.* К вопросу о музеефикации уникальной исторической территории древнего Полоцка / Т. А. Джумантаева // Исторические экспозиции региональных музеев в постсоциалистический период : сб. материалов Междунар. семинара, провед. в 2003–2004 гг. в России, Белорусии и Германии / отв. ред. И. В. Чувилова. – СПб., 2009. – С. 114–116.

*10. Добарская, В. А.* Значимость семейных коллекций для комплектования фондов (на примере научно-фондовой работы Музея города Новосибирска) [Электронный ресурс] / В. А. Добарская, О. Г. Кузнецова // Баландинские чтения. – 2013. – № 1. – С. 227–235. – Режим доступа: http://elibrary.ru/download/elibrary_21341846_83782479.pdf. – Дата доступа: 29.10.2020.

*11. Заяц, М.* Интерпретация и музеефикация культурного наследия на примере декоративно оформленного исторического центра города «Мозырский замок» / М. Заяц // Музей і традыцыйная культура Беларусі : II навук.-практ. канф., Мазыр, 30–31 мая 2012 г. / рэдкал.: С. В. Разанаў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мазыр, 2012. – С. 40–42.

*12. Змеул, А. А.* Музеи в культурном пространстве города: Комплексный анализ на примере Нижнего Новгорода 1985–2003 гг. : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 24.00.03 / А. А. Змеул ; Рос. ин-т культурологии. – М., 2004. – 22 с.

*13. Ильин, Л.* Музей города: Секция внутреннего убранства жилья / Л. Ильин. – Л. : Музей города, 1928. – 15 с.

*14. Карелина, Н. В.* Роль музейного маркетинга в культурном возрождении и развитии городов Беларуси на современном этапе / Н. В. Карелина // Гарады Беларусі ў кантэксце палітыкі, эканомікі, культуры : зб. навук. арт. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь ; Гродзенскі дзярж. ун-т імя Я. Купалы. – Гродна, 2007. – С. 331–335.

*15. Каулен, М. Е.* Музеефикация историко-культурного наследия России / М. Е. Каулен. – М. : Этерна, 2012. – 431 с.

*16. Каулен, М. Е.* Средовой музей в пространстве города [Электронный ресурс] / М. Е. Каулен // Молодежь и социум. – 2012. – № S. – С. 9–18. – Режим доступа: //elibrary.ru/download/elibrary_18216011_15854012.pdf. – Дата доступа: 29.10.2020.

*17. Королева, Н. С.* Роль муниципального музея в социокультурном пространстве города [Электронный ресурс] / Н. С. Королева // Ярославский пед. вестн. – 2012. – Т. 1, № 3. – С. 274–277. – Режим доступа: http://elibrary.ru/download/elibrary_18888592_59744393.pdf. – Дата доступа: 29.10.2020.

*18. Ладисова, Г. П.* Музей, который ждали... / Г. П. Ладисова // Белая Русь : рекламный торгово-пром. журн. Респ. Беларусь. – 2012. – № 2/3. – С. 11–14.

*19. Малкова, И. Г.* Городские музеи в культурном пространстве Уральского города второй половины XX века [Электронный ресурс] / И. Г. Малкова // Вестн. Челябинского гос. ун-та. – 2011. – № 34 (249). – С. 51–59. – Режим доступа: http://elibrary.ru/download/elibrary_17664645. – Дата доступа: 29.10.2020.

*20. Мастеница, Е. Н.* Музеефикация городской среды: подходы и методы [Электронный ресурс]/ Е. Н. Мастеница // Исторические, философские, политические и юридические науки, культурология и искусствоведение: вопросы теории и практики. – 2013. – № 10 (36). – С. 137–141. – Режим доступа: http://elibrary.ru/download/elibrary_20363802_23044564.pdf. – Дата доступа: 03.11.2020.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*21.* Музееведение: Музеи исторического профиля : учеб. пособие для вузов / И. Аве [и др.] ; под ред. К. К. Левыкина, В. Хербста. – М. : Высш. шк., 1988. – 431 с.

*22.* Музей города: К Октябрю 1927 : очерк музея и путеводитель. – Л. : Музей города, 1927. – 17 с.

*23.* Музеум : международный журнал / Организация Объединенных Наций по вопросам образования, науки и культуры. – 1996. – № 187. – 50 с.

*24. Назипова, Г. Р.* Казанский городской музей: Очерки истории 1895–1917 гг. / Г. Р. Назипова. – Казань : Казань, 2000. – 271 с.

*25. Николенко, В. П.* Музей истории столицы / В. П. Николенко // Музейное дело в СССР: музейная сеть и проблемы ее совершенствования на современном этапе : сб. науч. тр. / Центр. музей революции СССР ; редкол.: И. А. Антонова [и др.]. – М, 1985. – 233 с.

*26. Одинцова, О. В.* Музеи истории города как центры отражения городской истории [Электронный ресурс] / О. В. Одинцова // Вестн. Алтайской гос. пед. академии. – 2009. – № 9. – С. 77–79. – Режим доступа: http://elibrary.ru/download/elibrary_18936580_81340768.pdf. – Дата доступа: 03.11.2020.

*27. Осташкин, В. Н.* Вклад музеев города Москвы в развитие территорий столичного мегаполиса [Электронный ресурс] / В. Н. Осташкин // Вестн. МГУУ. – 2016. – № 1. – С. 23–27. – Режим доступа: http://elibrary.ru/download/elibrary_26274361_59225289.pdf. – Дата доступа: 29.10.2020.

*28. Петрова, Л. И.* Городской музей и власть, 1880–1930-е годы: Петербургский городской музей, Музей старого Петербурга, Музей города / Л. И. Петрова. – СПб. : Алетейя, 2015. – 311 с.

*29. Поляков, Т. П.* Город в музее: проблемы экспозиционной интерпретации [Электронный ресурс] / Т. П. Поляков // Культурологический журнал. – 2013. – № 4 (14). – С. 1–15. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/v/gorod-v-muzee-problemy-ekspozitsionnoy-interpretatsii. – Дата доступа: 27.10.2020.

*30. Романов, Н. И.* Местные музеи и как их устраивать / Н. И. Романов. – М. : Тип. Н. Желудковой, 1919. – 111 с.

*31. Романовский, И. С.* Музей истории и реконструкции Москвы / И. С. Романовский. – М. : Моск. рабочий, 1954. – 256 с.

*32. Рудаков, В. Е.* Музеи городские и областные : энцикл. сл. / В. Е. Рудаков. – СПб., 1897. – Т. XX. – С. 118–122.

*33. Толстогузова, О. В.* Провинциальный музей как образовательный и социокультурный центр города [Электронный ресурс] / О. А. Толстогузова, Е. И. Морозан, Л. А. Котлова // Междунар. журн. прикладных и фундаментальных исследований. – 2012. – № 5. – С. 104–105. – Режим доступа: http://elibrary.ru/download/elibrary_17847878_73909890.pdf. – Дата доступа: 29.10.2020.

*34. Томчук, С. А.* Дом, где поселилась история города Бреста / С. А. Томчук // Белая Русь : рекламный торгово-пром. журн. Респ. Беларусь. – 2014. – № 1/2. – С. 10–12.

*35. Трусаў, А. А.* Музеефікацыя беларускіх ратуш / А. А. Трусаў // 90 год Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею : матэрыялы навук. канф., Віцебск, 30–31 кастр. 2008 г. / рэдкал.: Г. У. Савіцкі, В. А. Шышанаў, А. І. Лагунова. – Мінск, 2009. – С. 9–14.

*36.* Устав Минского городского музея. – Минск, 1913. – 2 с.

*37. Федорова, Л. Д.* Становления і розвиток музеїв історіі міст України (XIX–XX ст.) : автореф. дис. … канд. іст. наук : 17.00.08 / Л. Д. Федорова ; Київ. держ. ін-т культуры. – Київ, 1994. – 23 с.

*38. Хадсон, К.* Влиятельные музеи / Кеннет Хадсон ; пер. с англ. Л. Мотылева. – Новосибирск : Сиб. хронограф, 2001. – 194 с.

*39. Чумичева, О. А.* Музей как пространство социокультурной самоидентификации в культуре города [Электронный ресурс] / О. А. Чумичева // Региональные архитектурно-художественные школы. – 2013. – № 1. – С. 140–144. – Режим доступа: http://elibrary.ru/download/elibrary_21480714_15613686.pdf. – Дата доступа: 29.10.2020.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*40. Чухманава, Г.* Музеефікацыя архітэктурных помнікаў Заслаўя / Г. Чухманава // Прыватнаўласніцкія гарады Вялікага Княства Літоўскага: лёс праз стагоддзі : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Нясвіж, 23–24 крас. 2014 г. / уклад. З. П. Яцкевіч. – Мінск, 2014. – С. 231–235.

*41. Щербакова, Е. В.* Музеи в культурном ландшафте современного города: модели развития [Электронный ресурс] / Е. В. Щербакова // Социокультурное развитие современного города: проблемы и перспективы : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Орел, 24–25 марта 2016 г. / гл. ред.: Н. А. Паршиков. – 2016. – С. 197–203. – Режим доступа: http://elibrary.ru/download/elibrary_28133141_48370797.pdf. – Дата доступа: 29.10.2020.

*42.* CAMOC: Museums of Cities Review [Electronic resource]. – 2011–2018. – Mode of access: http://network.icom.museum/camoc/. – Date of access: 19.11.2020.

*43.* City museums as centres of civic dialogue? [Electronic resource] / Amsterdam Historical Museum. – 2006. – Mode of access: https://hart.amsterdam/image/2017/5/17/2005_city_museums_as_centres_of_civic_dialogue.pdf. – Date of access: 27.10.2020.

*44.* Citystories [Electronic resource]. – 2014. – Mode of access: https://raineytisdale.wordpress.com/. – Date of access: 19.11.2020.

*45.* Our Greatest Artefact: the City. Essays on cities and museums about them [Electronic resource] // CAMOC. – 2012. – Mode of access: http://network.icom.museum/fileadmin/user_upload/minisites/camoc/PDF/CAMOCBookOurGreatestArtefactTheCity.pdf. – Date of access: 27.10.2020.

*46. Popiołek, M.* Od kamienicy do muzeum: historia siedziby Muzeum Warszawy na Rynku Starego Miasta: the history of the Museum of Warsaw's Site in the Old Town Market Square / Małgorzata Popiołek. – Warszawa : Muzeum Warszawy, 2016. – 287 s.

*Y. Kovaliova*

**Historiography of the study of city history museums**

*The article discusses the study of the historiography of city history museums in Belarusian, Russian and Western European museum science the end XIX end – to the beginning of XXI century. Stand chronological periods in the development of this theme. The basic directions in the study of museums of cities at this stage through analysis of publications professional journal of the International Association for the collections and museums in the history of cities, as well as international scientific conference proceedings from 2005 to 2019. Historiography of the history museums of cities of Belarus is covered in the context of the development of European science museology. Separately considered historiography of the city's museums in the aspect museification urban spaces and city historians.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 10.01.2020.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ